**Урок па беларускай мове ў 7 класе**

**Тэма:** Дзеепрыметнік як асобая форма дзеяслова: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля

***Мэта:***

- ✓ садзейнічаць асэнсаванню вучнямі дзеепрыметніка як асобай формы дзеяслова, яго марфалагічных прымет і сінтаксічнай ролі;
- ✓ фарміраваць уменне прымяняць веды пра дзеяслоў і прыметнік для выяўлення прымет дзеепрыметніка, знаходзіць дзеепрыметнікі ў тэкстах, адрозніваць іх ад прыметнікаў; пазнаёміць са стылістычнай функцыяй дзеепрыметніка;
- ✓ пазнаёміць са стылістычнай функцыяй дзеепрыметніка;
- ✓ пашыраць слоўнікавы запас мовы вучняў, прывіваць любоў да роднага слова.

**Тып урока:** урок вывучэння новага матэрыялу, першаснага замацавання ведаў і фарміравання ўменняў і навыкаў.

**Абсталяванне:** Валочка Г.М./Беларуская мова: вучэб.дапам. для 7 кл., карткі з заданнямі, тэставыя заданні, мультымедыйная прэзентацыя “Дзеепрыметнік – асобая форма дзеясловва”

**Ход урока.**

**I. Арганізацыйны момант.**

**II. Актуалізацыя раней вывучанага.**

1. Дарагія рабяты, я жадаю вам дабра, поспехаў і плённай працы! Сёння мы працягнем з вамі падарожжа па краіне “Марфалогія”. А ў час падарожжа ў нас будуць дзейнічаць законы дружбы, павагі адзін да аднаго, узаемавыручкі і ўзаемадапамогі. Тэма ўрока ў нас даволі незвычайная: на ўроку сёння будзе дуэт.

Як вы разумееце лексічнае значэнне слова “дуэт” *(калі нешта выконваецца двума партнёрамі: песня, танец і інш.).* А тэма нашага сённяшняга ўрока гучыць так: “Радаслоўная дзеепрыметніка”. Дзеепрыметнік. Давайце паглядзім на марфемную будову гэтага слова. Што вы заўважылі? *(два корані).* Вось чаму – дуэт. Што такое радаслоўная? *(Пералік пакаленняў аднаго роду, які ўстанаўлівае паходжанне і ступень роднасці.)*

2. Рабяты, давайце паспрабуем падрыхтаваць біяграфіі ўжо вядомых вам самастойных часцін мовы прыметніка і дзеяслова. *(Вучні робяць тэарытычныя паведамленні “Біяграфія прыметніка”, “Біяграфія дзеяслова”.)*

**III. Знаёмства з новай тэмай.**

1. Разгарніце сшыткі, запішыце дату і тэму ўрока.

2. Звернемся да вучэбнага дапаможніка, да практыкавання 37. (Ставім пытанне, вызначаем, што абазначае першае і другое слова, робім вывад, што словы *падрыхтаваны, зразумелы, …абазначаюць прымету паводле дзеяння. Гэта дзеепрыметнікі).*

3. Праца з параграфам 5. На аснове тэарэтычнага матэрыялу падручніка даваце паспрабуем скласці кластар “Дзеепрыметнік”*(складаем кластар па дзеепрыметніку).*



| Змяняецца: | Час: | Трыванне: |
|---|---|---|
| • Род<br>• Лік<br>• склон | • прошлы<br>• цяперашні | • незакончанае<br>• закончанае |

**IV. Засваенне новых ведаў.**

1. Праца са сказамі (на слайдзе). Прачытайце сказы, знайдзіце аднакаранёвыя словы і вызначыце іх лексічнае значэнне, а таксама вызначыць, да якой часціны мовы яны адносяцца:

*Чырвоная рабінка стаіць каля дарогі.*
*Пачырванела рабінка, што стаіць каля дарогі.*
*Пачырванелая рабінка стаіць каля дарогі.*

**Фізкультхвілінка**

На зарадку ўставайце.
Рукі ўгору падымайце.
Апусціце да плячэй.
Зноў – уверх, уніз хутчэй.
Улева галаву схіліце.
Управа тое ж паўтарыце.
Ды так некалькі разоў
Паўтарайце зноў і зноў.
А цяпер пара сядаць.
Будзем дружна працаваць.

2. Праца з падручнікам. Практ. 38 *(1 вучань каля дошкі, астатнія робяць запісы ў сшыткі).* Акружаны, пазелянелы, пачырванелы, расквечаны, пашыраны, зжаўцелы, напісаны, выраблены, прывезены, пасівелы, разгледжаны, зачараваны, пачарнелы, закінуты.

3. Знайдзі лішняе слова ў радках.
   1) Пажаўцелая, зарослыя, прыбраны, збялелы.
   2) Ацалелы, шэпчацца, куплены, пасеяны.
   3) Размешчаны, адкрытых, заснаваных, вывучаных.

4. Праца з практыкаваннем 40. Выпісаць дзеепрыметнікі, назваць дзеясловы, ад якіх яны ўтвораны. Вызначце трыванне і час дзеепрыметнікаў. Нечапаныя – незак.тр., пр.ч.; чытаныя – незак. тр., пр.ч.; перачытаныя – зак.тр., пр.ч.; кратаныя – незак.тр., пр.ч.; варочаныя – незак.тр., пр.ч.

5. Праца з тэкстам (на лістах). (Вучні чытаюць тэкст спачатку самастойна, а затым уголас). (Слайд).

Над вёскай, у полі была імглістая, зажураная смуга, быў прыхаваны смутак, няўлоўны нейкі і незразумелы, як настрой то сцішанага, шумліва-порсткага, роспачна-вясёлага, нават аж зіхоткага ўваччу і ўсе адно цёмнага ветру. Гэта нельга было выказаць словамі: ён, хлопчык, бачыў сябе жаўтлява-светлай саломінкай, вытыркнутай са страхі, – яна трымцела, грала,смуткавала і гарэзіла разам з ветрам; вецер шкуматаў яе, але ўсе адно любіў, і яна любіла яго… *(М.Стральцоў).*

Пытанні і заданні:
1) Да якога стылю адносіцца тэкст?(*Тэкст адносіцца да мастацкага стылю*).
2) Вызначце тып тэксту.(*Апісанне*).
3) Якая асноўная думка тэксту? (*Паказаць непарыўную сувязь чалавека і прыроды*).
4) Ці ёсць у тэксце дзеепрыметнікі? Назавіце іх. *(Вусна).*

6. Практыкаванне 41.

7. Пазнаёмцеся з цікавымі звесткамі з кнігі І. Шпадарука. Знадзіце дзеепрыметнікі. Марожанае. Яшчэ Гіпакрат рэкамендаваў марожанае сваім пацыентам. Ён лічыў, што “замарожаны крэм” актывізуе вадкаснае асяроддзе арганізма і паляпшае самаадчуванне. Вялікім аматарам марожанага быў

Аляксандр Македонскі. Жыхары Рыма рабілі спецыяльныя калодзежы, дзе захоўвалі лёд, каб выраблять гэты ласунак.

**V. Замацаванне новага матэрыялу.** Тэст па тэме “Дзеепрыметнік як асобая форма дзеяслова”.

1. Дзеепрыметнік – гэта…
1) Самастойная часціна мовы.
2) Асобая форма дзеяслова.
3) Службовая часціна мовы.
4) Форма прыметніка.

2. На пытанні якой часціны мовы адказвае дзеепрыметнік?
1) Назоўнік.
2) Дзеяслоў.
3) Прыметнік.
4) Прыслоўе.

3. У сказе дзеепрыметнік выконвае ролю:
1) Азначэння або выказніка.
2) Дапаўнення.
3) Акалічнасці.
4) Дзейніка.

4. Што абазначае дзеепрыметнік?
1) Прымету дзеяння.
2) Дадатковае дзеянне.
3) Прымету паводле дзеяння.
4) Дзеянне.

5. Сярод пералічаных слоў знайдзіце дзеепрыметнік.
1) Сіні.
2) Сінець.
3) Пасінець.
4) Пасінелы.

6. Сярод пералічаных слоў знайдзіце дзеепрыметнік жаночага роду.
1) Абяцанае.
2) Збялелыя.
3) Спісаны.
4) Адрэзаная.

7. Сярод пералічаных словазлучэнняў знайдзіце дзеепрыметнік незакончанага трывання.
1) Сінеючая даль.
2) Забытая песня.
3) Зроблены шалаш.
4) Вышыты рушнік.

Адказы: 1-2, 2-3, 3-1, 4-3, 5-4, 6-4,7-1. (Слайд)

**VI. Выстаўленне і каменціраванне адзнак.**

**VII. Дамашняе заданне.** (Слайд) § 5,практ.45.

**VIII. Рэфлексійны этап.** (Слайд )

Прачытайце пытанні. Адкажыце на любыя з іх.

1 Мяне ў дадзенай тэме ўрока больш за ўсе хвалюе…
2 Да пачатку ўрока я думаў(ла), што …, а цяпер думаю, што …
3 На ўроку мяне асабліва здзівіла і ўразіла, што…
4 Як мне працавалася на ўроку?
5 Што мне даў сённяшні дзень?

**Самааналіз урока , праведзенага 18. 11. 2019г.  у 7”А” класе**

Настаўнік беларускай мовы і літаратуры

Дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №2”  Патапеня Таццяны Канстанцінаўны

**Тэма:** Дзеепрыметнік як асобая форма дзеяслова: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля

***Мэта:***

- ✓ садзейнічаць асэнсаванню вучнямі дзеепрыметніка як асобай формы дзеяслова, яго марфалагічных прымет і сінтаксічнай ролі;
- ✓ фарміраваць уменне прымяняць веды пра дзеяслоў і прыметнік для выяўлення прымет дзеепрыметніка, знаходзіць дзеепрыметнікі ў тэкстах, адрозніваць іх ад прыметнікаў; пазнаёміць са стылістычнай функцыяй дзеепрыметніка;
- ✓ пазнаёміць са стылістычнай функцыяй дзеепрыметніка;
- ✓ пашыраць слоўнікавы запас мовы вучняў, прывіваць  любоў да роднага слова.

**Тып урока:** урок вывучэння новага матэрыялу, першаснага замацавання ведаў і фарміравання ўменняў і навыкаў.

***Формы работы:*** індывідуальная, групавая, калектыўная.

**Абсталяванне:** Валочка Г.М./Беларуская мова: вучэб.дапам. для 7 кл., карткі з заданнямі, тэставыя заданні, мультымедыйная прэзентацыя “Дзеепрыметнік – асобая форма дзеясловва”

Тып і структура ўрока адпавядаюць пастаўленай мэце, узроставым і індывідуальным асаблівасцям успрыняцця вучняў. Урок уяўляе сабой цэласную кампазіцыю. Усе этапы ўрока дастаткова прадуманы. Пераходы ад аднаго віда работы да другога – плаўныя, прысутнічала абагульненне па кожнай вучэбнай сітуацыі, дакладныя вывады.

На ўроку было выкарыстана праблемнае выкладанне матэрыялу, што садзейнічала развіццю даследчых здольнасцей вучняў. Напрыклад, пры знаёмстве са сказамі прапанавана  было знайсці аднакаранёвыя словы і вызначыць іх лексічнае значэнне, а таксама вызначыць, да якой часціны мовы яны адносяцца.

Ствараліся ўмовы для для развіцця пазнаваўчай актыўнасці і творчых здольнасцей вучняў.

На працягу урока звярталася  ўвага на літаратурнае вымаўленне, што дазваляла змагацца за чысціню роднай мовы.

Для папярэджання перагрузкі выкарыстоўвалася фізкультхвілінка.

Адступлення ад плана не было. Урок праводзіўся з выкарыстаннем прыёмаў інфармацыйнай тэхналогіі. Спалучэнне дадзеных формаў, метадаў і прыёмаў працы дапамагло вучням навучыцца прымяняць вывучаныя правілы на практыцы, забяспечыць добрую працаздольнасць, бадзёры настрой, ацаніць сваю дзейнасць у канцы ўрока. Гэта садзейнічала  дасягненню мэты, зрабіла занятак больш наглядным і цікавым для дзяцей.

Вучні справіліся з усімі заданнямі, былі актыўнымі, ахвотна ішлі на кантакт. Матэрыял урока быў разгледжаны ўсебакова з выкарыстаннем разнастайных форм і метадаў работы. Пры завяршэнні ўрока была праведзена рэфлексія.